Арцемава А.В., студ. гр. 402 ФКіСКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Ільюшына Л.Л.,
ст. выкладчык

# УЗАЕМАДАЧЫНЕННЕ КРЫЗІСНЫХ З’ЯЎ СУСВЕТНАЙ І АЙЧЫННАЙ ФІЛАСОФІІ

Крызіс – панятак шырокі, абагулены, таму – нязручны. Найперш: крызіс не азначае заняпад. Крызіс – поле рэакцыі, радыкальнае выпрабаванне вартасці сістэмы, нават сродкамі яе разбурэння. Такая сітуацыя вымагае рашэння (грэч. krisis – рашэнне, паваротны пункт), якое, аднак, немагчыма на той момант ацаніць адноснымі катэгорыямі лепшага ці горшага.

Крызіс сусветнай філасофіі як рэчаіснасці палягае ў наступным. У пераходныя эпохі філасофія заўжды становіцца крытычнай, бо вызначае момант перарыву традыцыяў, станаўленне новых філасофскіх парадыгмаў. Філасофія вызначае “балючыя кропкі” і глядзіць, у якіх узаемадачыненнях яны знаходзяцца, як праблема адной галіны адбіваецца на іншых. Толькі потым яна прапануе выйсце. Людская ж супольнасць не жадае чакаць выяўленне іншых і іх узаемасувязі. Сучаснае грамадства за карыснае і патрэбнае лічыць тое, што дае вынік, пажадана хуткі і рэчыўны. Гэта характарызуе супольнасць як супольнасць праектнага мыслення.

Крызіс сусветнай філасофіі як акадэмічнай праглядаецца праз не-прызнанне філасофіі як асаблівай сутнасці рацыянальна-спазнавальнай дзейнасці. Філасофія ўспрымаецца як філасофія навукі, філасофія гісторыі, як метадалогія, часам пад выглядам філасофіі можа падавацца нават ідэалогія. Веды, што мы называем філасофскімі, ў палітычнай сферы найчасцей ахначаюць засваенне тэхналогіі кіравання або падпарадкавання, адпаведна, не знаходзім тут філосафа – толькі паліттэхнолага. Такая дзейнасць шмат у чым профільная, таму сюды патрэбныя прафесіяналы. А філасофія – не зусім прафесія і зусім не спецыялізацыя, не аднавектарнае ўтварэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шэраг рысаў падвоеннага аблічча сусветнага філасофскага крызісу ўласцівыя таксама беларускай прасторы мыслення. Мы пачалі з мыслення абстрактнага – ступені рассудка. На ёй, паводле азначэння Гегеля, заканамерна адчувальны недахоп ведаў і тэрменалогіі, таму такое мыслене збольшага фрагментарнае [3, с. 72]. Дзеля таго, каб разважаць і прыйсці да пэўных высноў неабходна было распрацаваць стройныя тэрменалагічныя сістэмы, лагічныя канструкты, намацаваць актуальныя для сябе універсальныя ідэі. Усё гэта адбылося ў межах своеасаблівай лабараторыі, ролю якой адыграла Беларусь як інтэлектуальная праблема [1].

Далей нас заканамерна чакае новы ўзровень Беларускай філасофіі. Яго Гегель абазначае як ступеннь канкрэтнага мыслення. Яно мае сістэматэзаваны характар, паслядоўнае і адлюстроўвае дакладную ўзаемазлучанасць паняткаў[3, с.78]. Відавочна, патрэба ў такім мысленні наспела. Але якім чынам пераход да такога ўзроўню яго ажыццяўляць – пакуль не вядома. Адсюль - крызіс філасофіі як навукі і рэчаіснасці ўласна Беларусі. Інтэлектуальная “праблема Беларусь” на стадыі абстрактнага мыслення сфармаваная абстрактна, шырока, сталася самастойным дыскурсіўным кірункам. У сітуацыі спробы пераходу да канкрэтнай ступені, гэта сталася своеасаблівай метадалагічнай пасткай. Справа ў тым, што для вырашэння праблемы можна скарыстаць цэлы шэраг разастайных, разгалінаваных, навуковых і ненавуковых падыходаў. Такая ўласцівасць праблематыкі як з’явы была перанесеная на дыскурс як аб’ект і поле філасофскага роздуму. Адпаведна, аб’ёмістасць дыскурсу павялічылася ледзь не да неспасціжнай і хоць неяк канкрэтызаваць яго цяпер будзе зусім не проста.

Такім чынам, бачым, што агульнай уласцівасцю крызісу сусветнай і айчыннай філасофіі наперш з’яўляецца адмова рэфлексіі над бягучай сітуацыяй і пастава “ня-дзеяння”. У сусветным маштабе такі калабс палягае на звужэнне філасофскага дыскурсу даследвання. Спецыялісты ў галіне глабальнай філасофіі усё часцей заўважаюць, што сапраўдны крызіс з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

большага палягае не ў адсутнасці ці недасканаласці вонкавых структур, што маглі б забяспечыць аптымальнае функцыянаване зместу [5]. Яго вытокі – “чалавечы фактар”. Яны стоеныя ў адмове наноў-рэфлексіі над бягучай сітуацыяй, калі філосаф замест таго, каб шукаць падыходы да яе інтэлектуальага даследвання, рэфлексуе над тым, чаму даследванне такое немагчыма, або абмяжоўваецца характарыстыкай магчымых метедалагічных сродкаў.

Айчынная боязь спробы даследвання грунтуецца на празмернай шырыні дыскурса, яго неўладкаванасці і цяжкасцю з выхадам за яго межы. Сёння можна нярэдка пачуць, што Беларускай супольнасці адмаўляюць у наяўнасці самастойнай рэфлексіі як спосабу спасціжэння сябе няпростай [6]. Адсутнасць наяўнага філосафа ці сістэмы поглядаў, аднолькава бліскіх усім (або аднолькава ад усіх далёкіх) у Беларусі праграмуе канкрэтную асобу на фармаванне ўласнага светасузірання ўласнымі ж інтэлектуальнымі сіламі – такім чынам, маем у наяўнасці сапраўды філосафаў (няхай сабе і ананімна) – не паводле прафесіі, а паводле ладу жыцця і памкнення ўсвядоміць сябе як такога [7].

Прызнаныя раней “брэндавыя” філасофіі і класічныя філасофскія школы не маюць метадалогіі выйсця з сучаснага крызісу. Нашая ж філасофская школа пакуль не паўстала (прынамсі, класічным парадкам) і не глабальны, не лакальны крызіс перамогу над ёй не здабыў. Адпаведна, сфармаваная тут метадалогія мае ўсе шансы адаптавацца да няпростых актуальных абставін і прапанаваць свій досвед сусветнай супольнасці.

Відавочна, што неабходна і далей шукаць кропкі судакранання глабальнай і лакальнай філасофскіх традыцый. Толькі супольныя інтэлектуальныя намаганіі ва ўмовах актуальнага абвастрэння крызісных з’яў пакажуць выйсце, адэкватнае бягучым выклікам. Рэалізацыя падобнага супрацоўніцтва магчымая найперш пры ўмове не-адмовы ад рэфлексіі. Прыйшоў час папросту распачаць працэс мыслення, шмат у чым наноў, праклаўшы новыя рэчышчы і ўтварыўшы структуры мыслення,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

альтэрнатыўныя класічным. Якім метадам? Падаўшы прыклад ажыццяўлення рэфлексіі ў сённяшніх абставінах – рызыкнуць памысліць наяўную рэчаіснасць, колькі б штучных сведчанняў “супраць” не з’яўлялася звонку.

Спіс скарыстанай літаратуры:


1. *Акудовіч В.В.* Крызіс у праекцыі перспектывы "Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня". – СПб.: "Невский простор", 2003.

2. *Бабкоў Ігар* Крытычныя інтэлектуалы: сымбалічная барацьба і структурнае процістаяньне. Круглы стол ARCHE №6-2005.

3. *Труфанов С.Н.* “Наука логики" Гегеля в доступном изложении. Учебное пособие. - М.: Парус, 2008 , 187 с.

4. *Фурс Владимир* Белорусский проект «современности»? // Европейская перспектива Беларуси: интеллектуальные модели. Вильнюс, ЕГУ, 2007. С. 43-59.

5. Тэксты дакладаў Дваццаць другога Сусветнага Кангрэса Філасофіі 30 ліпеня – 5 жніўня 2008 г. ў Сеуле. Даступныя на рэсурсе http://www.congress2008.dialog21.ru/Doklady/14520.htm.

6. *Бобков Игорь* Особенности национальной философии. Артыкул даступны на рэсурсе http://sb.by/post/42057/.

7. *Козак Виктор* Белорусский философ: Споры белорусов и литовцев о наследии ВКЛ безразличны Европе (інтэрв’ю з Валерам Явароўскім). Артыкул даступны на рэсурсе Культура TUT.BY. – http://news.tut.by/culture/158631.html.

8. *Ладэс Дзмітры* Акудовіч.В.В. Філасофія на Беларусі, безумоўна, ёсць // Экспресс Новости - информационно-аналитический еженедельник, 2005 г.. Даступны на рэсурсе http://www.expressnews.by/773.html.

9. *Мамардашвили М.К., Э.Ю. Соловьёва Э.Ю, Швырёва В.С.* Классика и современность: две эпохи в развитии буржуазной философии //Философия и наука. – М., 1972.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Некрасов С.Н* Кризис философии в глобальном мире: фокусировка оптики (артыкул для часопіса). Паводле ўласнай перапіскі люты-красавік 2007 г. tyomalenina@mail.ru - nekrasov-ural@yandex.ru.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ